## Раздзел I

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ЎЗНІКНЕННЯ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## Тэма 1. ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНЫ СТАН ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА

Значную ролю ў развіцці беларускай дзіцячай літаратуры адыграў перыядычны друк. Актывізацыя руху па культурна-нацыянальным адраджэнні, які пашырыўся пасля рэвалюцыі 1905 г., спрыяла ўзнікненню шматлікіх перыядычных беларускамоўных выданняў (газеты «Наша доля», «Наша ніва», месячнік «Саха» і інш.). Аднак адчуваўся недахоп мастацкай літаратуры на роднай мове, асабліва для дзяцей і падлеткаў. Па гэтай прычыне А. Уласаў (пісьменнік, публіцыст, былы рэдактар «Нашай нівы») звярнуўся да мінскага губернатара з прашэннем *«дазволіць выданне беларускамоўнага месячніка для дзяцей і моладзі “Лучынка”»*[1]. Першы нумар гэтага літаратурнага і навукова-папулярнага выдання выйшаў у 1914 г., рэдактарам яго і стаў *А. Уласаў*. Часопіс меў 16 старонак (планавалася 32–48 старонак у кожным нумары)[2] і быў для таго часу добра ілюстраваны. Першы нумар выдання адкрываўся вершам Цёткі (А. Пашкевіч) «Лучынка»: *«Паволі, ціха, у роўнай меры // Будзем з лучынкай наперад спяшаць – // З вёскі у вёску, праз кожныя дзверы // Клікаць, каб моладзь святло выйшла ўзяць»*[3]. Мэта часопіса была вызначана Цёткай у звароце «Да вясковай моладзі беларускай», які быў надрукаваны ў другім нумары часопіса: *«Лучынка будзе старацца заглянуць у кожны*

---

[1] *Гімпель, Т.М.* Святло «Лучынкі» / Т. М. Гімпель // Роднае слова. 1994. № 7–8. С. 139.

[2] Тамсама.

[3] *Цётка.* Лучынка / Цётка // Выбраныя творы. Мінск, 2001. С. 86.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*куток нашай беларускай старонкі, пазнаць усе яе балючкі, паказаць іх табе, моладзь, і растлумачыць, якім спосабам з гэтых балючак вылечыць родную старонку»*[1]. Пачынаючы з трэцяга нумара, па прычыне занятасці А. Уласава ў месячніку «Саха», фактычным рэдактарам выдання становіцца *Цётка.*У часопісе друкаваліся такія вядомыя мастакі слова, як Я. Купала, Я. Колас, К. Буйло, У. Галубок, Зм. Бядуля, Ц. Гартны, А. Паўловіч і інш. У кожным нумары змяшчаліся і творы самой Цёткі. Пераважная большасць мастацкіх твораў была прысвечана сацыяльнай праблематыцы: цяжкае становішча сялянства, бяздольнае маленства, сіроцтва (верш Цёткі «Сірацінка», апавяданне «Міхаська», п'еса Зм. Бядулі «Смерць пастушка», верш Ц. Гартнага «Трэба жыць» і інш.).

У часопісе друкаваліся навукова-пазнавальныя матэрыялы па гісторыі («Даўнейшая натуральная гаспадарка і цяперашняе царства рубля» А. Жывіцы (А. Смоліча)), геаграфіі («Якога мы роду-племені» В. Ластоўскага, «Вулкан» А. Паўловіча). Так, напрыклад, у артыкуле В. Ластоўскага «Якога мы роду-племені» былі змешчаны цікавыя звесткі аб паходжанні беларусаў, геаграфічны, эканамічны матэрыял, які датычыцца тэрыторыі Беларусі, яе гарадоў. У часопісе ўпершыню падаваліся навукова-папулярныя артыкулы Цёткі («Гутаркі аб птушках», «Газа», «Пералётныя птушкі» і інш.), яе вандроўныя нарысы («З дарогі», «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю»). У сваіх публіцыстычных артыкулах А. Пашкевіч заклікала беларускую моладзь шанаваць родную мову, любіць Беларусь, з павагай ставіцца да свайго народа («Аб душы маладзёжы», «Да школьнай моладзі», «Шануйце роднае слова», «Папараць-кветка»).

«Лучынка» радавала чытача нядоўга – меней года (выйшла толькі шэсць нумароў). Першая сусветная вайна парушыла ўсе планы выдаўцоў: А. Уласаў быў прызваны ў войска – часопіс спыніў сваё існаванне.

У ноч з 25 на 26 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе бальшавікі правялі паспяховае ўзброенае паўстанне супраць Часовага ўрада.

Савецкая ўлада на тэрыторыі Беларусі была ўсталявана ў кастрычніку-лістападзе 1917 г. (на неакупіраванай тэрыторыі).

[1]*Цётка.* Лучынка / Цётка // Выбраныя творы. Мінск, 2001. С. 178.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Стварэнне беларускай дзяржаўнасці ішло ў цяжкіх, супярэчлівых умовах. Супрацоўніцтва бальшавіцкіх і дэмакратычных нацыянальных сіл не атрымалася. Беларускія нацыянальныя сілы зрабілі спробу стварыць беларускую дзяржаўнасць пры падтрымцы нямецкіх акупацыйных улад, і гэта спроба пацярпела няўдачу. Бальшавікі прыслухаліся да патрабаванняў нацыянальнага самавызначэння, была створана беларуская савецкая дзяржава, але яна адразу сутыкнулася з цяжкасцямі польскай інтэрвенцыі, у выніку якой значная частка тэрыторыі Беларусі адышла да Польшчы.

30 снежня 1922 г. БССР разам з РСФСР, УССР, ЗСФСР стала заснавальніцай Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). У краіне наступіла беларусізацыя – нацыянальна-культурная палітыка ў БССР у 20-я гады. Яна ўяўляла сабой комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на адраджэнне беларускай нацыі, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, развіццё нацыянальнай культуры, беларускай мовы, нацыянальнай школы, вылучэнне на кіруючыя пасады прадстаўнікоў карэннага насельніцтва.

На хвалі беларусізацыі надзвычай узрасла цікавасць да нацыянальнай культуры, літаратуры (у тым ліку і дзіцячай), пачаў інтэнсіўна пашырацца перыядычны друк. На другой сесіі ЦВК БССР (люты 1921 г.) упершыню на дзяржаўным узроўні вялася гаворка аб праблеме нацыянальнай адукацыі. У сувязі з гэтым паўстала пытанне аб распрацоўцы падручнікаў, падрыхтоўцы педагагічных кадраў, якія б маглі выкладаць на роднай мове; паўстала неабходнасць беларускамоўных выданняў: *«Ударнай задачай наркамасветы і яго органаў»* было *«выданне падручнікаў, дзіцячага часопіса, навукова-папулярнай і палітычнай літаратуры на беларускай мове < ...>»*[1].

Першым беларускамоўным выданнем для дзяцей пасля рэвалюцыі стаў часопіс «Зоркі» (1921–1922)[2]. Назва была сімвалічная: пяцікутныя зоркі на вокладцы свед-

---

[1]*Андрэева, Е.Г.* Адукацыя і педагагічная думка Беларусі: старонкі гісторыі: Перыяд беларусізацыі / Е.Г. Андрэева, Л.М. Лыч // Пачатковая школа. 2001. № 8. С. 32.

[2]У 1919 г. у Вільні была спроба выдаваць дзіцячы часопіс на беларускай мове. Захаваўся адзіны нумар часопіса «Зялёныя дрэўцы» (Вільнюс, 1919. № 1).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чылі, што прамені зорак зазірнулі ў кожны куток беларускай зямлі. Галоўным рэдактарам часопіса стаў *Зм. Бядуля*. У стварэнні часопіса прымалі ўдзел лепшыя прадстаўнікі тагачаснай беларускай культуры – Я. Купала, Я. Колас, К. Буйло, М. Чарот, К. Чорны, Я. Журба і інш. Аўтары публікацый імкнуліся да рознабаковага развіцця маленькага чытача, дбалі пра выхаванне яго на родным матэрыяле, блізкім дзіцячаму ўспрыняццю. У «Зорках» выкарыстоўваліся пераважна фальклорныя жанры – казкі, дзіцячыя песні, загадкі, а таксама бытавыя замалёўкі. На народнай аснове створаны казкі Зм. Бядулі «Мурашка», «Скарб», «Панская хвароба». На старонках часопіса пабачылі свет такія цудоўныя творы дзіцячай паэзіі, як вершы Я. Купалы «Песня і казка», «Мароз», «Сын і маці», пераклады Я. Купалы з рускай і польскай моў; вершы Я. Коласа, якія сталі хрэстаматыйнымі («Вясна», «Юрка і кот»), Зм. Бядулі («Сняжыначкі», «На пасецы»). Друкаваліся ў часопісе і празаічныя творы «Страшнае спатканне», «Наталька, Джон і муха» Я. Коласа, п'еса М. Чарота «Пастушкі». Часопіс адыграў важную ролю ў станаўленні і развіцці дзіцячага перыядычнага друку і літаратуры.

Пачынаючы са снежня 1924 г. на змену «Зоркам» прыйшоў штомесячны часопіс піянерскай тэматыкі пад назвай «Беларускі піянер»[1] (з 1929 г. – «Іскры Ільіча», з 1945 г. – «Бярозка»); першым галоўным рэдактарам часопіса быў *У. Дубоўка*, а адказным сакратаром – *А. Якімовіч*. На старонках часопіса друкаваліся разнастайныя творы: Я. Коласа (казкі «Рак-вусач», «Дзед і мядзведзь»), У. Дубоўкі (казка «Музыка-чарадзейнік»), З. Астапенкі (казка «Змаганне»), А. Якімовіча (апавяданні «Юрка», «Шэфы», «Гул бубна»), М. Зарэцкага (апавяданне «Бацькаў сын»), Зм. Бядулі (апавяданне «Кажы, дзе твой сын»). Піянерскай тэматыцы прысвечаны «Песня піянераў» А. Якімовіча, «Гімн піянераў» А. Гурло, песні разам з нотамі – «Буду піянер» (словы Александровіча, музыка Чарняўскага). Пяру У. Дубоўкі належалі тэксты наступных папулярных піянерскіх песень – «На прасторах сініх», «Піянеры», «Бліскавіцы над лясамі» і інш.

---

[1]Напачатку часопіс меркавалася назваць «Чырвоныя зоркі».



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Часопіс пашыраў кола дзіцячага чытання за кошт твораў, якія напачатку прызначаліся дарослым, і змяшчаў паэмы П. Труса, байкі і вершы маладога К. Крапівы і інш.

Рэдактары часопіса ўдумліва ставіліся да дзіцячых лістоў, карэспандэнцый, стымулявалі да творчай працы. Для гэтай справы быў арганізаваны спецыялізаваны аддзел, які рыхтаваў лісты пра вучобу, работу піянерскіх атрадаў, шэфства і г.д. Дзіцячыя творы, допісы былі не заўсёды дасканалыя ў мастацкіх адносінах, але іх друкаванне заахвочвала да далейшага самаўдасканалення, творчага пошуку.

Раздзел «Нашы браты ва ўсім свеце» быў прысвечаны асвятленню падзей міжнароднага жыцця. У ім змяшчаліся паведамленні, фотаздымкі, дакументальныя занатоўкі пра жыццё дзяцей у буржуазных краінах, пра лёс дзяцей за мяжой, нацыянальна-вызваленчы рух у калоніях, пра жыццё ў Заходняй Беларусі.

Значэнне часопіса ў літаратурным жыцці Беларусі цяжка пераацаніць, бо на старонках друкаваліся амаль усе самыя лепшыя творы тагачаснай дзіцячай паэзіі і прозы. Напрыклад, аповесць Я. Маўра «Чалавек ідзе».

У 1929 г. «Беларускі піянер» быў перайменаваны ў «Іскры Ільіча». У кожным нумары асвятляліся праблемы і падзеі таго часу: вынікі першай пяцігодкі, матэрыялы з'ездаў камуністычнай партыі, пералёт адважных лётчыц на Далёкі Усход. Пытанням міжнароднага жыцця быў прысвечаны асобны раздзел выдання «У краінах рабства, голаду і жабрацтва», у якім змяшчаліся не толькі матэрыялы аб бяздольным жыцці дзяцей за мяжой, але і фотаздымкі, што ілюстравалі сказанае. Творы таго часу маюць адценне дакументальнасці. Значнае месца займае жанр мастацкага нарыса (Я. Маўр «Драўлянае апавяданне», «Чорная кроў»). З часопісам супрацоўнічалі такія мастакі слова, як Я. Купала, Я. Колас, А. Якімовіч, Я. Маўр, Зм. Бядуля, Т. Кляшторны, Э. Агняцвет, К. Крапіва, М. Чарот.

Спецыяльная старонка была адведзена для зусім маленькіх чытачоў – дашкольнікаў. Там змяшчаліся аўтарскія творы, стылізаваныя пад фальклорныя, – калыханкі (Зм. Бядуля «Калыханка»), казкі А. Якімовіча, загадкі, жарты.

Для малодшых школьнікаў спецыяльнага раздзела не было, але ім былі адрасаваны творы пра і для акцябрат.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Напрыклад, «Пра слаўнага акцябронка Рому» Я. Маўра, «Іскры Ільіча» Я. Коласа, «Першы палёт» М. Лынькова, «Пра хлопчыка Боба і шкодныя мікробы» І. Каганоўскай.

Традыцыі «Беларускага піянера», які друкаваў допісы і першыя спробы пяра сваіх маленькіх чытачоў, працягнуў і часопіс «Іскры Ільіча», за ім – «Бярозка».

У Вільні з 1927 па 1931 г. выходзіў дзіцячы ілюстраваны часопіс «Заранка», які рэдагавала З. Верас (Людвіка Антонаўна Сівіцкая). Ёй даводзілася быць і аўтарам і карэктарам, і экспедытарам гэтага выдання, *«але энтузіязму хапала, каб, маючы 30 злотых дапамогі ад Беларускага пасольскага клуба, весці выданне, радавацца, што беларускія дзеці чакаюць свайго часопіса»*[1]. Разам з З. Верас у часопісе працаваў яе муж – А. Войцік, які займаўся перакладамі з рускай і ўкраінскай моў; дасылалі свае творы М. Машара, Г. Леўчык, С. Новік-Пяюн (псеўданім – Малады Дзядок), С. Крывец (Сярожа Пастушок), У. Паўлікоўскі (Унучак).

У першай кніжцы часопіса, якая выйшла 18 сакавіка 1927 г.[2], звяртаючыся да юных чытачоў, З. Верас адзначала: *«Трэба вам, дзеткі, прыяцеля, каторы заўсёды б меў гатовыя адказы на вашы пытанні, нёс вам і разрывак і карысць расказам аб нашай Бацькаўшчыне і яе жыхарах <...>; каб нёс святло вашым галоўкам, а ў малодзенькія душы клаў скарбы кахання ўсяго жывога, кахання Бацькаўшчыны-Беларусі, кахання Дабра і Працы»*[3]. Дзеля гэтага рэдактар знаёміла сваіх чытачоў з творамі Я. Купалы, Я. Коласа, А. Гаруна, Зм. Бядулі, друкавала фальклорныя творы, шматлікія матэрыялы пра культуру, гісторыю роднага краю. На старонках часопіса ўпершыню выступілі такія дзеячы культуры і літаратуры Заходняй Беларусі, як Я. Пачопка (Я. Башкір), С. Крывец, М. Кепель (Маруся з Антокалю) і інш.

Па-ранейшаму матэрыяльнае становішча выдання было складаным, нават нягледзячы на дапамогу чытачоў. Фармат часопіса стаў кніжным, нумары выходзілі спаранымі. *«Дзеці, – успаміНала Зоська Верас, – стараліся*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

---

[1] *Верас, З.* Каласкі / З. Верас // Адданасць / Я. Саламевіч. Мінск, 1985. С. 60.
[2] У 1927 г. выйшла 9 нумароў (кніжак) часопіса, у 1928 – 4; 1929 – 3; 1931 – 2.
[3] *Верас, З.* Каласкі / З. Верас // Адданасць / Я. Саламевіч. Мінск, 1985. С. 60.

*самі, з уласных заробкаў аплаціць падпіску. <...> Старэйшае наша грамадзянства, асабліва віленская беларуская інтэлігенцыя, захоўвала поўную абыякавасць да «Заранкі»... Ні слова падтрымання або хоць бы крытыкі»*[1]. Не выратавалі часопіс і сабраныя ў 1928 г. беларускімі эмігрантамі ў Амерыцы 27 даляраў. У 1931 г. часопіс спыніў сваё існаванне.

Вопыт працы ў «Заранцы» быў выкарыстаны З. Верас у часопісе «Пралеска», які яна рэдагавала на працягу 1934–1935 гг. (з 1935 па 1939 г. рэдактар часопіса – А. Каткевічанка). Як і «Заранка», гэтае выданне для дзяцей ставіла на мэце не толькі маральна выхоўваць юных чытачоў, але і прывіваць ім любоў да роднай мовы, культуры. На старонках часопіса змяшчаліся творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, заходнебеларускіх аўтараў, фальклорныя творы, пераклады з рускай і ўкраінскай класікі.

На сучасным этапе развіцця літаратуры для дзяцей на роднай мове выходзяць часопісы «Бярозка», «Вясёлка», «Лесавік», газета «Раніца».

Штомесячны дзіцячы часопіс ЦК ЛКСМБ і Рэспубліканскага савета піянерскай арганізацыі імя У.І. Леніна «Бярозка» пачаў выходзіць у 1945 г. Як вядома, напачатку ён меў назву «Беларускі піянер», затым «Іскры Ільіча».

Выданне вылучаецца зайздросным доўгажыхарствам, якое стала магчымым дзякуючы штодзённай карпатлівай працы рэдакцыі па адборы, пошуку і афармленні мастацкага і публіцыстычнага матэрыялу. Апошнім часам галоўным рэдактарам часопіса працаваў У. Ягоўдзік.

Сярод твораў, якія змяшчаліся на старонках часопіса, – лепшыя здабыткі дзіцячай літаратуры і твораў для юнацтва. З выданнем супрацоўнічаюць А. Бадак, Р. Барадулін, Д. Бічэль, Г. Бураўкін, В. Гардзей, В. Зуёнак, У. Мазго, С. Панізнік, М. Чарняўскі, У. Машкоў, П. Місько, А. Наварыч, Л. Рублеўская, С. Тарасаў, В. Ткачоў, А. Федарэнка. Матэрыялы часопіса не толькі цікавыя і займальныя, але надзённыя і глыбока выхаваўчыя па сваім змесце. Тут друкуюцца цыклы публікацый пра славутыя

[1] *Каха초ўская, Т.* Праз усё жыццё. Зоська Верас і яе «Заранка» / Т. Каханоўская // Роднае слова. 1992. № 9. С. 64.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мясціны Беларусі – Ружаны, Полацк, Камянец, Косава, Гродна, Мінск, Мсціслаў. Пісьменнік У. Мароз падрыхтаваў серыю апавяданняў па гісторыі Беларусі «Ланцужок айчыннай гісторыі» (XII–XX ст.), якія прасякнуты ідэямі беларускага дома, еднасці, павагі да роднай гісторыі. Выхаванню працавітасці, прафарыентацыйным пытанням прысвечаны матэрыялы пра розныя прафесіі, нарысы пра майстроў сваёй справы ў раздзеле «Знайдзі сваю сцяжыну».

Публікуюцца на старонках некаторых нумароў і творы навуковай фантастыкі, якія, з'яўляючыся вельмі папулярнымі сярод юнацкай аўдыторыі, захапляюць, далучаюць, стымулююць яе да чытання на беларускай мове (напрыклад, В. Кастручын «Бывай, Чэлсі!», А. Кірвель «Той-Бераг»).

Удала працягвае сваю дзейнасць адзін са старэйшых, бадай, самы папулярны і шматтыражны з часопісаў Беларусі «Вясёлка», рэдактарамі якога ў розныя часы былі славутыя майстры слова В. Вітка, Е. Лось, А. Грачанікаў, У. Ліпскі. Асноўнымі кірункамі працы часопіса з'яўляюцца вызначаныя яшчэ В. Віткам задачы: *«Трэба навучыць дзяцей любіць сваю радзіму; трэба прывіць ім любоў да роднай мовы, спадчыны, гісторыі, культуры; трэба, каб дзеці нашы ўмелі шанаваць людзей, якія цярпліва выводзяць іх на жыццёвыя пуцявіны. Усё гэта разам і ёсць тая нацыянальная ідэя, увасабленне якой у душы і сэрцы дзяцей робіць іх сапраўднымі патрыётамі»*[1].

Адпаведна тэматыцы, вызначанай рэдакцыяй, былі створаны рубрыкі: «Тэатр Васі Вясёлкіна» (сцэнкі, сцэнарыі беларускамоўных пастановак і свят), «Крышку пра кніжку» (анатацыі на новыя кнігі для дзяцей), «Кацілася торба» (фальклорныя матэрыялы – гульні, апавяданні, казкі, жарты, забаўлянкі), «Паштовы галубок» (допісы чытачоў), «Хвілінкі-весялінкі» (вершыкі, скорагаворкі, крыжаванкі, загадкі, анаграмы, задачы, рэбусы, вясёлыя пытанні), «Вернісажык "Вясёлкі"» (малюнкі чытачоў і парады прафесійных мастакоў), «Была вайна» (да 60-годдзя Перамогі). Асобныя старонкі прысвечаны юбілеям беларускіх пісьменнікаў. Іх структура двухчастковая: не-

---

[1] *Ліпскі, У.* Не выжываю, а жыву / У. Ліпскі // Сябар і настаўнік дзяцей / М.Б. Яфімава. Мінск, 2005. С. 77.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вялікі ўступ – біяграфічны артыкул пра пісьменніка і яго лепшыя творы.

Звязвае разнародны матэрыял у адно не толькі беларускамоўнасць, высокі мастацкі ўзровень, тэматычная блізкасць твораў, але і агульны персанаж усіх нумароў часопіса Вася Вясёлкін. Выданне гаворыць з чытачамі яго вуснамі – даступна, добразычліва, шчыра.

Дазваляе працаваць не толькі на чытача малодшага школьніка, але і дзетсадаўца чытанка-маляванка для дашкольнікаў «Каласавічок», у якой ёсць і вершы, і загадкі, і кароткія апавяданні, і казкі, даступныя малому слухачу, і размалёўкі, якія садзейнічаюць выпрацоўцы ўмення трымаць алавак, фарміруюць кісць рукі дзіцяці – рыхтуюць да навучання ў школе.

Выданне не абмяжоўваецца творамі беларускіх пісьменнікаў – тут можна сустрэць пераклады з польскай, літоўскай, рускай, украінскай моў.

З 1995 г. радуе маленькіх чытачоў фотачасопіс «Лесавік», заснавальнікам і выдаўцом якога стаў У. Ягоўдзік. Рэдакцыя так вызначыла від гэтага выдання – часопіс сяброў прыроды: экалагічнае выданне для сям'і і школы. Яго дэвізам можа быць верш М. Танка «Экалогія», вынесены на плакат спецвыпуска «Бараніце прыроду ад пажараў»: *«А мы, прызнацца, // Хоць і мінулі // Тысячагоддзі, // І да гэтага часу // Не ўмеем хадзіць // Па зямлі // Так, як дні і ночы, // Звяры і птушкі, // Ветры і дажджы. // Няўжо не бачыце, // Як яе здратавалі, // Вытапталі, // Пакалечылі? // А яшчэ збіраемся // Такія ж сляды // Пакінуць // І на іншых планетах»*[1] (1984).

Асаблівасцю выдання з'яўляецца выдатнае афармленне, у якім з поспехам выкарыстоўваюцца рэдкія фотаздымкі, посцеры птушак і звяроў вядомага зоафатографа І. Бышнёва, фотазагадкі «Пазнай птушку (жывёлу)». З'яўляюцца цэлыя тэматычныя нумары-фотарэпартажы пра нацыянальныя паркі Беларусі («Браслаўскія азёры», «Нарачанскі»). Трэба адзначыць, што некаторыя каментарыі да фотаздымкаў і матэрыялы зроблены на рускай мове.

---

[1]*Танк, М.* Экалогія / М. Танк // Лесавік (спецвыпуск да № 1). 2004. С. 1.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вялікую ўвагу выдаўцы надаюць экалагічнаму выхаванню падрастаючага пакалення на літаратурным матэрыяле: імі запрошаны да супрацоўніцтва А. Пісьмянкоў (вершы пра прыроду), А. Наварыч (апавяданне «Жукалень»), К. Кірэенка (апавяданне «Жураўліныя дзянёчкі»), В. Дубіловіч («Самотныя званочкі»), В. Сугойдзь («Рахманыя дзікі»). У рубрыцы «Лесічоўка» («Бібліятэчка Лесавіка») рэдакцыя праводзіць прэзентацыі новых беларускамоўных кніг пра прыроду У. Ягоўдзіка, А. Пісьмянкова, У. Марука і іншых аўтараў.

Садзейнічаюць абуджэнню лепшых пачуццяў еднасці з прыродай, любові да яе пераклады з іншых моў. Так, у адным з нумароў быў змешчаны біяграфічны артыкул пра рускага прыродазнаўцу В. Біянкі[1], пасля якога былі надрукаваны яго кароткія творы «Краснагон», «Гаспадар лесу» ў перакладзе на беларускую мову.

Актывізацыі чытацкай аўдыторыі, абуджэнню цікавасці дзяцей да прыроды садзейнічае правядзенне конкурсу «Казкі беларускага лесу». Вялікая ўвага надаецца ліставанню з чытачамі, дзіцячай творчасці. Шырока выкарыстоўваюцца дзіцячыя малюнкі, рэдагуюцца і публікуюцца казкі, вершы, апавяданні юных аўтараў («Як лячылі рэха», «Каб я была казачніцай», «Дзівосныя пацеркі», «Вядзі нас, жолуд», «Сінявочка», «Дзьмухаўцова мара», «Наш лес», «Мой добры дружа»).

Умеюць рэдактары, выхоўваючы, і забаўляць цікаўнага чытача. У канцы кожнага нумара адведзена старонка для забаўлянак, скорагаворак, акразагадак (жанравая разнавіднасць загадак, дзе адгадку можна прачытаць па першых літарах вершаваных радкоў), размалёвак. У разварот часопіса часта ўшываюцца настольныя гульні, як, напрыклад, «Смелы вожык»[2], «У госці да Дзеда Мароза»[3], для гульні ў якія дастаткова склеіць фішкі або мець звычайны кубік.

На роднай мове традыцыйна звяртаюцца да маленькага чытача каталікі. Напрыклад, у 90-я гады выходзіў беларускамоўны рэлігійны часопіс «Маленькі рыцар Беззаганнай», дадатак да каталіцкага выдання «Ave Maria»,

[1]*Танк, М.* Экалогія / М. Танк // Лесавік (спецвыпуск да № 1). 2004. С. 6–8.
[2]Гл.: Лесавік. 2004. № 5.
[3]Гл.: Лесавік. 2004. № 6.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

заснаванага Мінска-Магілёўскай дыяцэзіяй (рэдактар – І. Жарнасек). Галоўны персанаж часопіса – хлопчык, «Маленькі рыцар Беззаганнай».

Рубрыкі часопіса звяртаюць увагу чытача на розныя аспекты жыцця верніка: «Рыцар Беззаганнай» расказвае пра жыццё святых, «Нашы захапленні» – пра дзіцячую творчасць, «Цудоўныя абразы Беларусі» – пра гісторыю іх стварэння і цуды, рубрыка «Наш свет прыроды. І мы ў гэтым свеце» змяшчае нататкі, фотаздымкі чытачоў і г.д.

Сярод іншых часопіс вылучаецца не толькі тэматыкай, але і мастацкім афармленнем. Мастачка Г. Хінка-Янушкевіч зрабіла яго цёплым, жыццярадасным, светлым.

«Маленькі рыцар Беззаганнай» знаёміць сваіх сяброў з вершаванымі апавяданнямі (І. Жарнасек «Знойдзеная згуба»), песнямі (Р. Грушэцкі «Разгорнем блакіту штандары» (пераклад з польскай), «Веру, Пане»), вершамі (М. Дукса «Усмешка нябёсаў», Д. Бічэль «У карагодзе хмарак і анёлаў»), апавяданнямі («Сумныя дні»), легендамі («Радасная смерць Кверыны»), казкамі (І. Жарнасек «Малеча»).

Матэрыялы па праблемах выхавання дзяцей, мастацкія творы для іх змяшчаюцца і ў часопісах «Пачатковая школа», «Пралеска», «Роднае слова», «Адукацыя і выхаванне», «Бібліятэка прапануе», «Пачатковае навучанне».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова